# Агляд сайтаў,

## прысвечаных адукацыі ў сферы ўстойлівага развіцця

### http://www.aseko.org



Сайт асацыяцыі "Экологическое образование" (АсЭкО). Адрасаваны ўсім, хто зацікаўлены ў паляпшэнні экалагічнага становішча сродкамі адукацыі і займаецца:

- экалагічнай адукацыяй;
- адукацыяй для рашэння экалагічных праблем;
- адукацыяй для ўстойлівага развіцця.

Утрымлівае навіны экалагічнай адукацыі краін СНД і Балтыі.

Сайт забяспечвае набыццё друкаваных метадычных матэрыялаў па падпісцы і заказу па пошце, атрыманне інфармацыі пра ўмовы навучання сучасным метадам на семінарах-трэнінгах для выкладчыкаў, бясплатную электронную рассылку аператыўнай інфармацыі і метадычных матэрыялаў невялікага аб'ёму, а таксама магчымасць публікацыі на прызавой конкурснай аснове аператыўнай інфармацыі і ўласных метадычных распрацовак любога аб'ёму; удзел у конкурсах выкладчыкаў і навучэнцаў.

На сайце можна падпісацца на часопіс "Вестник АсЭкО" і на электронны бюлетэнь АсЭкО-Информ asekoinfo@ecoline.ru.

**Спасылкі на віртуальныя рэсурсовыя цэнтры:**

- **www.eeexchange.org**
  **Environmental Education Exchange** — праграмы адукацыі ў сферы навакольнага асяроддзя, кансультацыйныя паслугі;
- **www.eelink.net**
  **Environmental Education Link** — інфармацыйная сетка экалагічнай адукацыі, утрымлівае спасылкі на сайты экалагічных арганізацый;
- **www.epa.gov**
  **Environmental Education Center US Environment Protection Agency** — праграмы і практыкаванні па экалагічнай адукацыі, інфармацыя пра семінары, канферэнцыі, конкурсы; інтэрактыўныя старонкі для школьнікаў сярэдняга звяна;
- **www.naaee.org**
  сайт **Паўночна-Амерыканскай асацыяцыі экалагічнай адукацыі**;
- **www.wildnet.ru/Russian/1pred.htm**
  **ЭкаЦэнтр "Заповедники"** — свет прыроды ў свецегульняў: досвед фармавання адносінаў да прыроды (на рускай мове);
- **www.umweltprogramme.de/millenniu**
  **"Міленіум: наступны крок"** — інавацыі, падыходы і практычныя дзеянні па экалагічнай адукацыі;
- **http://www.gsu.edu/~wwwgtp/**
  **Праект Global Thinking.**
  **Атланта, штат Джорджыя, ЗША**

Праект, прызначаны для навучання "новаму мысленню" дзяцей. Праект "Глабальнае Мысленне" (ПГМ) — гэта адукацыйны праект у сферы навакольнага асяроддзя, які аб'ядноўвае студэнтаў і выкладчыкаў з усяго свету. Галоўная задача праекта — дапамагчы дзецям зразумець, што праблемы, якія лічацца навуковымі, могуць мець таксама сацыяльнае, палітычнае і эканамічнае значэнне.